# У дружнай сям'і народаў СССР

★

*П. ПАНАМАРЭНКА,*

**Старшыня Совета Міністраў Беларускай ССР і сакратар ЦК КП(б)Б**

★ ★ ★

9 лютага 1947 года адбудуцца выбары ў Вярхоўны Совет Беларускай ССР. У гэты дзень беларускі народ выбера вышэйшы орган дзяржаўнай улады рэспублікі; выбера людзей, здольных ажыццяўляць кіраўніцтва Беларускай соцыялістычнай дзяржавай у адказнейшы час яе жыцця і развіцця: у перыяд ліквідацыі цяжкіх вынікаў нямецкага разбою, у перыяд выканання грандыёзных заданняў сталінскага пяцігадовага плана.

З найвялікшым натхненнем і радасцю сустрэлі выбаршчыкі паведамленне аб тым, што таварыш Сталін даў згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Гэтую вестку беларускі народ сустрэў новымі вытворчымі перамогамі ў барацьбе за выкананне плана пасляваеннай сталінскай пяцігодкі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Совецкая Беларусь унесла значны ўклад у агульную справу разгрому фашысцкай Германіі. Працоўныя рэспублікі поплеч з усімі народамі СССР абаранялі сваю соцыялістычную айчыну. Звыш аднаго мільёна беларусаў знаходзілася ў радах Совецкай Арміі. Сотні тысяч беларускіх партызан пры падтрымцы ўсяго народа і пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі самаадданна змагаліся супроць ненавіснага ворага.

Абараняючы разам з усімі народамі СССР соцыялістычную айчыну, адстойваючы вялікія заваёвы, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі, беларускі народ абараняў плады сваёй працы і дасягненняў за час совецкай улады.

Створаная Леніным і Сталіным Беларуская рэспубліка прайшла велізарны шлях палітычнага, эканамічнага і куль-

ны гаспадаркі, дзе не прыходзілася-б пачынаць усё спачатку, або амаль спачатку.

З першых-жа дзён вызвалення ў рэспубліцы закіпела грандыёзная стваральная работа, маштабы якой няспынна растуць. Аб'ём капітальных укладанняў у народную гаспадарку Беларускай ССР, зробленых у 1946 годзе і намечаных на гэты год, з'яўляецца найвышэйшым за ўвесь час існавання рэспублікі.

Ёсць першыя, але ўжо адчувальныя вынікі гэтых творчых намаганняў. У рэспубліцы адноўлены і даюць прадукцыю больш 6.000 прадпрыемстваў. Сярод іх — такія буйныя прадпрыемствы, як Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва, Мінскі радыёзавод, шклозавод імя Сталіна, Ваўкавыскі цэментны завод, Гомельскі, Мінскі, віцебскія станкабудаўнічыя і іншыя.

Разгарнулася будаўніцтва аўтамабільнага і трактарнага заводаў у Мінску. На аўтазаводзе ўведзены ў строй цэхі аўтапрычэпаў, інструментальны, дапаможнага абсталявання, будаўнічых дэталей. Паспяхова аднаўляецца мясцовая прамысловасць, прадукцыя якой у мінулым годзе дасягнула 83 процантаў даваеннага ўзроўню.

насельніцтва. У 1947 годзе мы павінны поўнасцю ліквідаваць усе зямлянкі і перасяліць жывучых там у новыя дамы.

У гарадах і раённых цэнтрах рэспублікі адноўлена і нанава пабудавана 1.750 тысяч квадратных метраў жылой плошчы. Адкрыта больш 11.000 пачатковых і сярэдніх школ, ідуць заняткі ў 25 вышэйшых навучальных установах, у 100 тэхнікумах і іншых сярэдніх навучальных установах.

Вынікі аднаўленчых работ у рэспубліцы значныя. Аднак у святле агульнага становішча Беларусі яны нікога задаволіць не могуць. Неабходна скарыстаць усе рэзервы, якія ёсць у рэспубліцы, для выканання і перавыканання планаў аднаўлення прамысловасці і росту прамысловай вытворчасці, аднаўлення пасеўных плошчаў, павышэння ўраджайнасці і аднаўлення жывёлагадоўлі, г. зн. для агульнага павышэння тэмпаў аднаўлення народнай гаспадаркі.

Новым пяцігадовым планам перад рэспублікай пастаўлены грандыёзныя задачы. Павялічваецца аб'ём аднаўленчых работ у прамысловасці, ствараюцца новыя галіны прамысловасці—аўтамабільная, трактарная, цяжкага машынабудаўніцтва (лакамабілі, турбіны), будуюцца буйныя электрычныя станцыі. Усё гэта вызначае перспектыву далейшага індустрыяльнага развіцця рэспублікі ў размерах, значна перавышаючых даваенныя.

У сельскай гаспадарцы на працягу пяцігодкі трэба поўнасцю аднавіць пасеўныя плошчы і ўзняць ураджайнасць вышэй даваеннага ўзроўню.

Асаблівая ўвага ў пяцігадовым плане